**Вайсковыя пахаванні Першай сусветнай вайны**
**Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.**

*Інфармацыя Ніны Рыгораўны Марчук, краязнаўцы з Кобрынскага раёна Брэсцкай вобл.*

## 1) Вайсковыя пахаванні каля вёскі Гайкоўка (Каташы).

*Звесткі атрыманы ад Уладзіміра Давыдавіча Макарука, жыхара в. Гайкоўка, які паведаміў аб падзеях І сусветнай вайны (са слоў сваіх бацькоў) і падзеях ІІ сусветнай вайны (з уласных успамінаў).*

У жніўні 1915 г. адбыўся першы бой паміж рускай і нямецкай арміямі, які завершыўся стратамі з абодвух бакоў. Рускія войскі адступілі ў бок Кобрына. Пахавальны ўзвод кайзэраўцаў з нямецкай арміі прысыпаў зямлёй загінулых рускіх і немцаў ў тых месцах, дзе яны загінулі. Раненыя рускія трапілі ў нямецкі палон. Палявыя шпіталі былі разгорнуты ў захопленым немцамі Кобрыне.

Пры адыходзе фронту далей на ўсход мясцовае насельніцтва разам з немцамі пачало збіраць і на вазах адвозіць мёртвыя целы немцаў і рускіх у некалькі глыбокіх каналаў, выкапаных каля дарогі.

Праз некаторы час кайзэраўцы пабудавалі манумент у выглядзе шэрага бетоннага квадратнага слупа, які прастаяў на дарозе Кобрын – Маларыта больш чым паўстагоддзя. На версе помніка ўзвышалася вялізная бетонная германская вайсковая каска. Да манумента таксама была прымацавана шыльда на нямецкай мове, прысвечаная падзеям 1915 г. пад Гайкоўкай.

Недзе ў 1943 г. нямецкія жаўнеры ІІ сусветнай вайны сагналі на месцы пахаванняў мясцовых жыхароў, якія разам з імі адкопвалі косці нямецкіх жаўнераў І сусветнай вайнй для іх перавозу ў Нямеччыну. Праца вялася на падставе мапаў кампаніі 1915 г., якія меліся ў немцаў. На месцы згаданых раскопаў засталіся незасыпаныя траншэі.

Праз год, калі Кобрын быў вызвалены ад фашыстаў, ужо савецкія жаўнеры пачалі звозіць у гэтыя траншэі каля бетоннага манумента непатрэбныя нямецкія боепрыпасы і ўзарвалі іх. Ад гэтага выбуху пацярпеў і бетонны манумент.

Цяпер на месцы пахавання – гарадская сметніца, пад якой, верагодна, працягваюць знаходзіцца рэшткі рускіх жаўнераў 1915 г.

## 2) Вайсковыя пахаванні каля вёскі Ізабелін.

*Звесткі атрыманы ад Феадосія Феадосьевіча Раманюка, жыхара в. Ізабелін.*

Пахаванне ўзнікла ў той жа час і па той жа прычыне, што і могільнік каля Гайкоўкі (Каташоў). У цэнтры размяшчалася пахаванне рускіх, а вакол іх – магілы кайзэраўцаў. Усё пахаванне было абкапана глыбокім ровам, абкладзена вялікімі камянямі на цагляным падмурку. Пасярод пахавання ўзвышаўся высокі дубовы крыж.

У 1937–1938 гг. у Ізабелін прыехалі нямецкія вайскоўцы, якія з дапамогай мясцовых жыхароў, раскапалі брацкую магілу і вывезлі рэшткі сваіх жаўнераў у Нямеччыну. Пахаванні рускіх засталіся некранутымі.

З часам курган зарос травой і кустоўем, а крыж згніў. У 2006 г. мясцовы калгас "Васходзячая зара" добраўпарадкаваў згаданы курган, усталяваўшы ў яго цэнтры новы крыж.

**3) Вайсковыя пахаванні каля вёскі Балота (Гірск).**
*Звесткі атрыманы ад Алены Паўлаўны Левай, жыхаркі в. Балота.*
Пахаванні кайзэраўскіх жаўнераў датуюцца 1915 г. і размяшчаюцца ў форме кола побач з мясцовымі могілкамі, зачыненымі напачатку XX ст. Праз паўметры ад згаданых пахаванняў змяшчаюцца надмагільныя бетонныя пліты, з надпісамі на нямецкай мове, таксама датаваныя 1915 г.
Згодна афіцыйнай інфармацыі рускіх пахаванняў на могілках няма, аднак варта дапусціць, што іх маглі пахаваць у цэнтры (як гэта было зроблена ў Ізабеліне) або на старых вясковых могілках недалёка ад нямецкіх магілаў. Найбольш старая частка гэтых мясцовых пахаванняў зарасла кустоўем і бэзам, месцамі з зямлі выдаюцца надмагільныя помнікі.
Пахаванні немцаў у ідэальным стане і, паводле пэўнай інфармацыі, даглядаюцца валанцёрамі.

**4) Вайсковыя пахаванні каля вёскі Бародзічы і мястэчка Гарадзец.**
*Звесткі атрыманы ад Еўдакіі Шыдлоўскай, былой жыхаркі в. Бародзічы.*
У верасні 1915 г. паміж Бародзічамі і мястэчкам Гарадзец на беразе Дняпроўска-Бугскага канала адбыўся бой паміж немцамі і рускімі. Рускія адступілі, а немцы пахавалі сваіх у глыбокай траншэі на беразе канала, дзе ўсталявалі высокі круглы бетонны слуп з надпісам па колу на нямецкай мове. Бетонны слуп з часам быў знішчаны, верагодна мясцовымі жыхарамі для закладкі фундамента сваіх будынкаў. Такім чынам, пахаванне немцаў у Бародзічах загубілася.
Пахаванне рускіх вайскоўцаў 1915 г. размяшчалася на невялікім узгорку паблізу вёскі. Прыкладна ў 1970–я гг. пры пабудове новай дарогі на Бародзічы экскалатар падняў на паверхню чалавечыя чарапы і косткі рускіх вайскоўцаў. Пры гэтым прысутнічалі настаўнік гісторыі з Гарадца Васіль Міхайлавіч Чыркун і дырэктар Кобрынскага музея Аляксей Міхайлавіч Мартынаў. Акрамя чарапоў і костак былі знойдзены набойкі ад ботаў, патрантаж з патронамі ад рускай вінтоўкі (датаваны 1909–1911 гг.), запісная кніжка на імя нейкага Громава, гільзы ад нямецкіх патронаў. Цікава, што чарапы амаль усе прастрэлены (каля 80 штук), што сведчыць пра верагодны растрэл палонных. Рэшткі жаўнераў сабралі і перапахавалі на бродніцкіх могілках. Цяпер узгорак зроўнены з зямлёй і парослы кустоўем.
Наступствы згаданага вышэй бою паміж Бародзічамі і Гарадцом таксама прымусілі немцаў пахаваць частку сваіх каля сцяны Гарадзецкага касцёла, пабудаванай у пачатку XIX ст. Сцяна была каля 100 метраў шырынёй і каля метра вышынёй, складзеня з камяня. Зверху ў яе цэглу было ўмуравана бітае шкло. З унутранага боку касцёла хавалі настаяцеляў храма, мясцовую шляхту. Там жа знаходзіліся рэшткі бацькоў вядомай пісьменніцы Марыі Радзевіч (1863–1944), ураджэнкі суседняга сяла Грушава, а таксама пахаванні рускіх

часоў 1812 г. З другога боку сцяны кайзэраўцы пахавалі сваіх забітых жаўнераў 1915 г. На магілы паклалі пліты з надпісамі на нямецкай мове.
У 1962 г. ўлада перадала касцёл мясцоваму калгасу пад склад мінеральных угнаенняў. Тады ж бульдозерам была знішчана сцяна. Камяні і пліты з пахаванняў былі перавезены на фундамент будучага сушыльнага завода, які дзейнічае і дагэтуль, у адрозненні ад касцёла.

**5) Вайсковыя пахаванні каля сяла Тэўлі.**
*Звесткі атрыманы ад Майі Іванаўны Гамолы, жыхаркі с. Тэўлі.*
Пахаванні ўяўляюць сабой брацкую магілу, змешчаную на мясцовых могілках, каля дарогі Тэўлі – Стрыгава, недалёка ад чыгуначнай станцыі. На могілках пахаваны чырвонаармейцы 1920–х гг., а таксама нямецкія і рускія жаўнеры, загінулыя ў 1915 г. Пахаванне кайзэраўцаў размешчана двума паралельнымі шэрагамі магілаў. На іх знаходзіліся надмагільныя камяні з надпісамі на нямецкай мове.
У 1970–я гг. могілкі былі засыпаны пяском, але затым адроджаны – адкапаны і падняты надмагільныя камяні, адмыты надпісы на іх. У цэнтры могілак размяшчаліся крыж і стэлла. Падчас згаданых падзей быў згублены вялізны памятны камень з нямецкім надпісам аб тым, што на могілках акрамя немцаў пахаваны і рускія. Аднак пасля прыборак у 1980–х гг. на могільніку з’явілася пліта з надпісам аб пахаванні на ім рэштках 200 воінаў рускай арміі, немцаў і 50 чырвонаармейцаў.

**6) Вайсковыя пахаванні каля в. Паляцічы.**
*Звесткі атрыманы ад Надзеі Іванаўны Марчук, жыхаркі суседняй вёскі.*
Невялікі некропаль з пахаваннямі 1915 і 1920 гг. (падзеі першай сусветнай і польска-савецкай войнаў) знаходзіцца ў ляску з правага боку ад дарогі Кобрын–Жабінка побач з вёскай Паляцічы. З боку дарогі на ўзгорку добра бачныя прыбраныя сцежкі, надмагільныя пліты з надпісамі на нямецкай і польскай мовах. Надмагільныя надпісы на польскай мове акрамя польскіх жаўнераў згадваюць і чырвонаармейцаў.
Пачынаючы прыблізна з 2003 г. пахаванні знаходзяцца пад апекай нямецкіх валанцёраў. Па чутках, там пахаваны і рускія.
У кіламетры ад некропаля знаходзіцца ўзгорак, на якім у 1970-я гг. экскалатар адкапаў чалавечыя косці, набіраючы пясок для пабудовы фермы ў в. Батчы. Дадзенае пахаванне таксама можа належыць ахвярам першай сусветнай вайны. Згаданыя косткі сабраны і перапахаваны не былі.

**7) Вайсковыя пахаванні в. Залессе (вёска размяшчаецца ва ўсходнім напрамку ад Кобрына).**
*Звесткі атрыманы ад Васіля Сцяпанавіча Пацеюка, былога жыхара в. Залессе.*
На мясцовых могілках размяшчаліся дзве брацкія магілы з пастаўленымі на іх двума вялікімі дубовымі крыжамі. Згаданыя пахаванні могуць адносіцца да падзей 1915 г. і належыць як рускім, так і немцам. Дадзеныя пагоркі яшчэ

заўважаюцца на могілках, на адным дагнівае драўляны крыж. Некропаль зарос бур’янам.
Адзін помнік вылучаецца з шэрагу звычайных вясковых пахаванняў – гэта чугунны маналіт каля двух метраў у вышыню, на якім змешчаны надпіс на рускай мове: “Граф Александръ Иосифовичъ Мендоза де Ботелло умеръ 15 мая 1877 г.”.